ность за них. После осознания этого, по-другому понимаешь фразу «мы в ответе за тех, кого приручили»…

Общество само должно ограничивать право и возможность членов социума подвергать усыплению животных. Это должны делать только люди, у которых есть моральное, интеллектуальное и профессиональное право. Как ни странно, такими людьми являются как раз те, кому доверено лечить и спасать животных. Я говорю о враче ветеринарной медицины.

Современное западное общество на данном этапе более бережно относится к животным. Эвтаназия в ветеринарной практике теперь не является единственным способом решения целого ряда ветеринарных проблем, но пока еще считается допустимым явлением.

«Когда это уже нужно делать?» Владельцу в определенном смысле проще принять решение, чем врачу. Проще потому, что есть только два пути: либо «да», либо «нет». А у доктора всегда десяток сомнений: диагноз? прогноз? анализы? препараты? Все ли сделано правильно и вовремя.

Эвтаназия животного – не терпит непрофессионализма и спешки. Это необходимо объяснять студентам факультета ветеринарной медицины. Важно пояснять, что приняв решение об усыплении, исправить уже ничего нельзя. Для формирования компетенций и профессионального мышления целесообразно на учебных занятиях обозначать тему «отношение к животным» сквозь призму ответственности за жизнь и здоровье к ним.

УДК 357. 23 (091) “1913” (476.6)

## У ПОШУКАХ УЗОРНАЙ ГАСПАДАРКІ: ПРЭТЭНДЭНТЫ І ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ НА ЎЗНАГАРОДУ АД ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ГОНАР 300-ГОДДЗЯ ДЫНАСТЫІ РАМАНАВЫХ

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У межах цэлага шэрагу мерапрыемстваў па ўсёй Расейскай імперыі з нагоды святкавання 300-годдзя кіравання сямейства Раманавых сваю лепту ўнеслі і асобныя ведамасныя структуры, у тым ліку Галоўная Управа Землеўпарадкавання і Землекарыстання і яе тэрытарыяльныя



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

структуры (ГУЗіЗ). У адпаведнасці з цыркулярам кіраўніка ГУЗіЗ ад 8 чэрвеня 1913 г. (№ 102), адрасаванага гарадзенскаму губернатару, і на падставе зацверджаных у той жа дзень правіл было прапанавана ад Гарадзенскай губерні вылучыць некалькі *«сельскіх абывацеляў»*, якія б вылучаліся ўзорным гаспадараннем на сваіх землях.

Сама па сабе гэтая акцыя мела юбілейна-паказны характар, паколькі на правядзенне сур'ёзнай і аб'ектыўнай адзнакі патрабаваўся час і больш дакладныя крытэрыі, чым «узорнасць». Тым не менш, запланаваная акцыя салідарнасці з манархіяй была праведзена на працягу менш чым двух месяцаў. Канчатковае рашэнне па кандыдатурах было прынята ўжо 1 жніўня 1913 г., што відаць па копіі пратакола журнала Асобнай агранамічнай нарады пры Гарадзенскай губернскай землеўпарадкавальнай камісіі, якая прайшла пад старшынствам выконваючага абавязкі губернатара П. Баярскага [1, арк. 115]. Камісія была даволі прадстаўнічай: акрамя губернскіх ураднікаў, прысутнічалі павятовыя маршалкі, сябры павятовых землеўпарадкавальных камісій і асобна аграномы: *Дзедаў, Міраў, Фашчэўскі, Казачэнка, Гарленхрон, Крыжаваздвіжанскі, Мiраеў, Ламберг, Славінскі* [1, арк. 115].

Згодна з *«Правіламі прысуджэння прэмій»* на ўсю акцыю расейская дзяржава ахвяравала 75 000 рублёў, якія разбіваліся на 300 вышэйшых і меншых прэмій. Уласна на Гарадзенскую губерню выпадала 1000 рублёў, з якіх належала ўзнагародзіць за ўзорнасць дзве гаспадаркі сумамі па 300 рублёў і дзве за частковы прагрэс па 200 рублёў [1, арк. 1-5 адв., 116]. Стаўка рабілася, у першую чаргу, на тых, хто выселіўся на хутар, г.зн., ішоў у рэчышчы вызначаных Сталыпінскай рэформай пераўтварэнняў.

На пасяджэнні 1 жніўня 1913 г. былі абвешчаны ўжо канчатковыя вынікі конкурсу, у якім удзельнічалі прэтэндэнты па паветах і было адабрана 20 чалавек.

Табліца – Кандыдаты на ўзнагароды

| Павет | Прэтэндэнты і іх месца жыхарства |
|---|---|
| Гродзенскі | 1. Ігнат Ігнатавіч Парай (Сухаўляны, Скідзельская валасць)<br>2. Фама Венядзіктавіч Рэкаць (Сухаўляны, Скідзельская валасць)<br>3. Аляксандр Ігнатавіч Антухевіч (Дудкі, Берштаўская валасць)<br>4. Рыгор Мікалаевіч Саковіч (Дудкі, Берштаўская валасць) |
| Сакольскі | 1. Вікенцій Міхайлавіч Свенц (Вылудкі, Трафімаўская валасць)<br>2. Юльян Іванавіч Беляўскі (Новастойла, Трафімаўская валасць) |
| Беластоцкі | 1. Франц Войцехавіч Дабрагоўскі (Вялікае Дабрынева, Беластоцкая валасць);<br>2. Станіслаў Пятровіч Жукоўскі (Вялікае Дабрынева, Беластоцкая валасць) |
| Бельскі | 1. Рыгор Паўлавіч Крот (Грыгораўцы, Дубяжынская валасць)<br>2. Кузьма Мікалаевіч Хількевіч (Храболы, Райскай валасць) |



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Працяг табліцы

| | |
|---|---|
| Берасцейскі | 1. Іван Іванавіч Ходзька (Кавердзякі, Матыкальская воласць)<br>2. Іпаліт Іванавіч Хапалюк (Вялікарыта, Вялікарыцкая воласць)<br>3. Самсон Савіч Хеўк (Вялікарыта, Вялікарыцкая воласць)<br>4. Раман Матвеевіч Шубовіч (Бердзічы, Косічская воласць) |
| Кобрынскі | 1. Фёдар Якаўлевіч Максімук (Бухавічы, Падалеская воласць)<br>2. Парфені Арцёмавіч Гарбацэвіч (Сачэўкі, Дружылаўская воласць) |
| Слонімскі | 1. Ціхан Ільіч Крагель (Стрыгін, Пескаўская воласць)<br>2. Фёдар Васілевіч Казінец (Новае, Пескаўская воласць) |
| Ваўкавыскі | 1. Трафім Ігнатавіч Руда (Крамяніца, Самаравіцкая воласць)<br>2. Фелікс Ігнатавіч Філіповіч (Мсцібава, Мсцібаўская воласць) |

*Крыніца: НГАБ у Гародні. Ф. 868. В. 1. спр. 32*

Для выяўлення лепшых сялянскіх гаспадарак была праведзена даволі вялікая праца, за якую адказвалі павятовыя землеўпарадкавальныя камісіі. Працавалі яны ва ўмовах абмежаванага часу і не заўсёды паспявалі за вызначанымі губернатарам тэрмінамі. Так, яшчэ 20 ліпеня 1913 г. старшыня Берасцейскай землеўпарадкавальнай камісіі інфармаваў губернскага агранома, што да належнага тэрміну (22 ліпеня) спіскі кандыдатур не можа выслаць, паколькі павятовая Асобная нарада па гэтым пытанні адбудзецца толькі 27 ліпеня [1, арк. 12]. Да патрэбнага часу паспела прадставіць сваіх кандыдатаў Гарадзенская асобная нарада, якая адбылася 20 ліпеня [1, арк. 15]. Адзначыць трэба, што вылучэннем кандыдатаў займаліся ў тым ліку і спецыялісты-аграномы. Так, на Слонімскай асобнай нарадзе выступіў з дакладам-прапановай і адпаведнай характарыстыкай гаспадарак і дзейнасці сялян (Ф. Казінец і Ц. Крагель) аграном Міраў і яго довады былі падтрыманыя [1, арк. 17-20]. Адметна, што працэдура абмеркавання кандыдатур не была фармальнай. Так, да высланага ў Гродна камплекта дакументаў з слонімскай нарады было далучана *«Асаблівае меркаванне»* земскага начальніка 1-га ўчастка Слонімскага павета Нікоціна, які катэгарычна адмовіўся лічыць прапанаваныя Міравым кандыдатуры прыкладам *«узорнасці»*. Такіх гаспадарак, па меркаванні земскага начальніка, было даволі шмат, і яны нічым асаблівым ад іншых не адрозніваліся, а яго рэзюмэ цалкам дэзавуіравала рэкамендацыю Мірава: *«з апошнім довадам дакладчыка, на яго думку, самым істотным, што калі Слонімскі павет не дасць якіх-небудзь кандыдатаў, то ўсе прэміі дастануцца Кобрынскаму павету, дзе маюцца ўзорныя гаспадаркі, я пагадзіцца не магу, так як лічу, што для атрымання прэміі, асабліва такой значнай, неабходны конкурс сапраўды ўзорных гаспадарак, якімі ні гаспадарка Крагеля, ні Казінца лічыцца не могуць»* [1, арк. 21]. Як відаць, адбор некаторых прэтэндэнтаў незаўсёды вытрымліваў крытыку.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Хаця пошук лепшых узораў быў часткай абавязкаў адказных сяброў павятовых Асобных нарадаў, цікавасць да ўдзелу ў конкурсе выявілі таксама некаторыя прыватныя асобы з высокай асабістай самаацэнкай. Пры гэтым некаторыя пачалі інфармаваць аб сваіх дасягненнях яшчэ да моманту публікацыі шэрагу афіцыйных дакументаў. Так, у ГУЗіЗ сваю кандыдатуру для ўзнагароды 500-рублёвай *«Прэміяй на ўспамін 300-годдзя Дома Раманавых»* прапанаваў Васіль Паўлавіч Стэцкі, уласнік хутара ля вёскі Яглевічы ў Боржынскай воласці Слонімскага павета. Цікава, што яго ліст быў складзены яшчэ 25 лютага 1913 г., а ўжо на пачатку сакавіка быў афіцыйна зарэгістраваны [1, арк. 23-24 адв.]. В. Стэцкі гуляў на апярэджанне невыпадкова: ён быў чалавекам адукаваным (23 гады працаваў настаўнікам Галенчыцкай народнай вучэльні), меў практычны вопыт вядзення аднаасобнай гаспадаркі і неабходныя тэарэтычныя веды, атрыманыя падчас навучання ў «настаўніцкай семінарыі» ды на розных профільных курсах [1, арк. 23]. Свае перавагі ён абгрунтоўваў аўтарытэтам, якім карыстаўся: *«Маючы перакананне, якое заснавана на шматгадовай практыцы, як дзіўна ўздзейнічае на сялян жывы прыклад школы і якую вялікую карысць у сэнсе культурна-эканамічнай дапамогі здольны даць цемнай беларускай веске настаўнік...»*, але ў фінале выявілася, што высокія сельскагаспадарчыя ініцыятывы прывялі Стэцкага да запазычанасцей перад банкам і лагічных «сумных» перспектыў [1, арк. 23-24 адв.]. Па схеме выбудаванай логікай урадніцкіх распараджэнняў, згодна з правіламі і цыркулярамі, пайшоў селянін вёскі Бародзіч Зэльвенскай воласці Ваўкавыскага павета Пётр Паўлавіч Качук [1, арк. 137-138]. Праўда, палова заявы пра яго *«працаруплівасць»*, напісанай ад імя Качука іншай асобай, складалася з апісання пабудаванага ў 1910 г. вогнетрывалага каменнага збудавання, дзе ён дазволіў размяшчаць мясцовую царкоўнапрыходскую вучэльню [1, арк. 138].

У межах збору інфармацыі ў павятовыя агранамічныя нарады і губернскую камісію траплялі не толькі пратаколы пасяджэнняў са спісамі кандыдатур, але і даволі падрабязныя характарыстыкі як гаспадарак (час выхаду на хутар ці набыцця зямлі, памер уладання, спецыялізацыя, апісанне будынкаў, колькасць жывелы і інвентару, тэхналогія вытворчасці, фінансавая інфармацыя), так і саміх гаспадароў і іх сем'яў. Напрыклад, пра селяніна вёскі Вялікарыта Самсона Хеўка паведамлялася, што ён мае 50 год, праваслаўны, выконвае абавязкі сельскага старосты, жанаты і мае трох сыноў, адзін з якіх ужо тры ці чатыры гады жыве ў Амерыцы, другі – прыняты на вайсковую службу, а трэці – мае 11-12 гадоў [1, арк. 74].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Вынікамі пасяджэння 1 жніўня 1913 г. стала прысуджэнне прэмій вышэйшай катэгорыі беластаччаніну Ф. В. Дабрагоўскаму і кобрынцу Ф. Я. Максімуку, меншыя прэміі былі аддадзены селяніну Слонімскай воласці Ф. В. Казінцу і селяніну Сакольскай воласці В.М. Свенцу [1, арк. 117]. Лідар гонкі Ф. Дабрагоўскі, які выйшаў на хутар у 1908 г. і меў ворнай, сенакоснай і іншая зямлі каля 20 дзесяцін, 10 дойных кароў і шэсць галоў маладняка, уласны сепаратар, вёў пяціпольны севазварот, займаўся садаводствам, што было адзначана яшчэ ў папярэдняй характарыстыцы наступным чынам: *«усе бакі яго невялікай гаспадаркі знаходзяцца на вышыні, якой пазайздросціла б не адна абшарніцкая гаспадарка»* [1, арк. 49-49 адв.]. Другі атрымальнік прэміі вышэйшай катэгорыі таксама не належаў да бядняцкага кола: сям'я Максімукоў набыла вялікі надзел ў 1901 г., частка якога, пасля падзелу бацькоўскай спадчыны ў 1910 г., перайшла да Ф. Максімука. Сумарны памер яго хутара склаў 13,63 дзесяціны, што, па адзнацы кобрынскага павятовага агранома Шыраева, які па загадзе мясцовай землеўпарадкавальнай камісіі склаў падрабязнае апісанне гаспадаркі Максімука, перавышала сярэдні памер хутароў у Гарадзенскай губерні [1, арк. 53-58]. Асноўны прыбытак Ф. Максімуку прыносіла паляводства, але сваю ролю адыгрываў таксама сад (17 яблынь, 30 груш, 15 вішань і 4 чарэшні) і агарод, дзе ў *«вялікіх памерах»* на продаж вырошчвалася капуста; меліся два вуллі, адзін з якіх *«сістэмы Лявіцкага»* [1, арк. 54 адв.-55].

Кампанія па вызначэнні лепшых сялянскіх гаспадарак была праведзена ў вельмі сціслыя тэрміны, што мала спрыяла аб'ектыўнасці вынікаў. Грошы, прызначаныя для ўзнагароды, належала размеркаваць пры любым раскладзе ў адпаведнасці з загадам. Цяжка сказаць, ці былі пераможцы і прэтэндэнты сапраўды «узорнымі» гаспадарамі, але, прынамсі, іх праца адпавядала і нават перавышала сярэднія паказчыкі па губерні. Само мерапрыемства сведчыла пра адсутнасць у губерні паўнавартаснай мікраэканамічнай статыстыкі ў галіне сельскай гаспадаркі, наступствам чаго была хаатычнасць у ажыццяўленні аграрнай палітыкі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гародні. Ф. 868. В. 1. спр. 32.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ